

Міхась Стрыгалёў

Чырвоныя казармы







МІХАСЬ
СТРЫГАЛЁЎ

Чырвоныя казармы

ЛІРЫКА

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1978

Бел 2
С 87

С $\frac{70403-005}{М302(05)-78}$ 64–78

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1978 г.

Пляцоўкі і пралескі

1

БЕЛАЯ РУСЬ

Быццам яблык у бабіным леце,
пахнуць губы твае на дасвецці.
Водар мёду і мяты
ў гарачых начах,
у садах вераснёвых на веццi
не ўтаймуецца аніяк.
Яблык падае, падае —
пакаціўся на шлях...

Ты — з начы, з трапяткога святла
(яблык падае, падае —
у палёце бясконцым)...
На віры — твае вочы — апала імгла:
цень ад яблыка ці ад сонца...

Яблык падае.
Быццам у плазме Сусвету,
затрымцела, успыхнула тайна ў вачах.
Быццам зноў зарападам мінулага лета
абдае, абсыпае нас
Буйніцкі шлях...

Яблык падае ў полі —
і чуецца зноўку
паланянак рыданне
і поўні пагляд...

І грудзей перасмяглых
у іржэўніку колкім
белы выгін...
Заломлены рукі назад...

Зноўку — попел і дым,
зноўку плач паланянак,
нібы плач перапёлак-бяглянак...

Дай мне рукі твае, не маркоцься ў журбе —
я цябе панясу ад бяды па сяўбе...
Ты маўчыш — я цягнуся, але дацягнуцца
(яблык падае, падае...)
не магу да цябе.

І здаецца: у небе заплакалі гуслі —
жураўліны нарог
рэжа хмар дзірваны Белай Русі...

Блякне полымя.
— Да цябе дацягнуся! —
я крычу, толькі голас знікае на лузе...

Ты ключом жураўліным
звініш нада мною,
з воч знікаеш,
але твой палёт
ува мне не змаўкае,— і яблык нанова
ў сэрцы падае, падае —
сонечны плод...

* * *

А ў полі вярба
пахілёная,
маладая дзяўчыначка
заручоная...

Юнацтва ранак!
Ты здаля
сваім блакітам
асвятляеш
драбіны бацькі і каня,
дарогу ў горад каля гаю,
мяне і бацьку — спакваля.
Мяне ты ў людзі выпраўляеш.

...Дзесяты год пасляваенны
грукочуць колы па карэнні
екацярынінскіх дубоў.
І прабягае міма ельнік,
і не вяртаецца дамоў.

Дзень добры,
Буда-Кашалёў!
Сядзім у ліпах на скамейцы,
ў чаканні мінскага. Святло
цячэ праз лісці: ў паняверцы
глядзім на мокрае вясло —
адкуль яно ў пажарнай дзежцы?
П'ем піва з бацькам, зноў сядзім
і па-ранейшаму глядзім.
Вясло у сэрцы застанецца!

А дзе апусціцца яно
у плынь жыцця, вясло юнацтва?

Тут, на вакзале, пра адно
мы з бацькам думаем, прызнацца.

Развітваюся назаўсёды
з світальнай вёскай ля Дняпра,
з касой пясчанай каля водаў,
з лазінай нашага двара,—
адзіным росчыркам пяра...

ЧЫРВОНЫЯ КАЗАРМЫ

Чую зноў: «Чырвоныя Казармы!» —
палкавая музыка здалёк...
Трубачы ўстаюць і будзяць зарыва.
Гарадок на пляцы струніць крок.

Трубы, трубы... Не змаўкае голас,
над палкамі ўскінуты ў зеніт.
Мне насустрач падпаручнік Колас
па прыступках шабляю звініць.

Грае чырвань на штыках пяхоты —
то Гарматны ўзняў чырвоны сцяг.
Не! Паэту ўручаная рота
на прыцэл не возьме рабацяг!
Час сумеўся! Зрушыўся імгненна —
камандармы ходзяць на рысях.
Расхінае сцены апалчэнне,
выплывае на сібірскі шлях.
Дзе журбу лісця шалёны вецер
з дрэў шпурляе ў непрытомнасць траў,—
у тайзе таварыш
на дасвецці
на скаку,
пасечаны,
упаў.

Не пачуў ён, як замоўклі трубы,
як прамчаліся байцы праз дым,—
камісар балюча сціснуў зубы,
нахіліўся ў роспачы над ім.

У запасе ўспомняць камандармы
маладосць... Урал... далёкі бой —
запяюць Чырвоныя Казармы
песню Рэвалюцыі самой...

Прагучаць у велічы і гуле
крокі пад казарменнай сцяной.
Можа, час змяняе каравулы?
Можа, снег?
А можа, лістабой?

Мусібыць, дзяўчына вінавата,
што праходзіць сонцам ля варот,—
аглядае сінявой пагляда
ўзвод аховы, каменданцкі ўзвод?

. . . .

Вартавы! Прашу цябе, мой дружа,
заглушы ў сабе дзявочы крок —
ты паслухай, як душу варушыць
вецер гераічных перамог.

Для цябе, магчыма, ранкам ранніх
запяюць пабудку трубачы —
і ўзмахнуцца полымем крамяным
сцен цагліны, быццам кумачы...

БАЛАДА ПРА КАВАЛЯ ЛЮДОТУ

Анатолю Вялюгіну

За кузняю божка паганскі
заліўся сляпымі слязьмі.
І дыхае горан кавальскі
Людотаў усімі грудзьмі.

І б'юць малаты па кавадлу
(Іванка ускідвае патлы) —
і радасны ў майстра пагляд:
варагам і лацінянам
на зайздрасць куецца булат.

Людота работай дзівоснай
любуецца моўчкі здаля.
Клінок на адплату і помсту —
не зганьбіць, дальбог, каваля!

У рукі, як славу, чаляднік
бярэ абцугамі клінок —
і перцы над шлемам булатным
у думках трымцяць незнарок.

Ды нешта ж нахмурыўся майстра,
і сам — мажа сажаю лоб:
кляймо на булаце уласным
не горш ад заморскіх было б...

«Што ж, гэта бяда — не турбота,—
пяе белазуба Іван.—
Хай майстра празванне, Людоты,
аздобіць булатную грань!»

Кірыліцай піша Іванка,
ды так, што ні час, ні іржа
не возьмуць яе пад курганам
на беразе стромым Сажа...

«Ну што ж, так і быць, адпускаю
з мячом цябе ў Ігараў полк.
Здабудзь сабе славу, а краю
свабоду здабудзь...» — і замоўк...

За кузняю божка паганскі
ўсе выплакаў слёзы свае.
Грымоты ці горан кавальскі? —
Ды гэта ж Людота куе!

ЧАСІНА ЦВІЦЕННЯ ВЕРАСУ

Часіна цвіцення верасу — верасень.
Пах мядзяны ляціць над імхамі.
Казыча ласіныя храпы на ўзлеску
і, пранізліва чысты,
сочыцца пад нагамі.

Да дня — такаванне грушцоў у сасонніку:
што там будзе пад ранне — туманы?
Касякі жураўоў над рагатым прастогнуць,
зноў апусцяцца на паляны.

Сонца ў руху. Цвіценне верасу.
Дай руку мне сваю, дарагая,—
у мінулым не ўсё яшчэ. Вер мне.
Пойдзем. Хай ён шамоча, верасень,
пад тваімі нагамі.

Пойдзем! Хай храбусцяць пад нагамі
і крывёю пырскаюць на імхі касцянiцы.
Так... Дурман захаплення — за намі.
Кліч цвярозы наперадзе,
вечных птушак станіцы.

Гэта — поўдзень кахання. Далёка яшчэ да вечара.
Стыне белы туман над сасновым аўралам.
І ляцяць жураўы, разразаючы крыллем вечнасць
над табой, над Уралам...

СІНЯЕ ЎЗБЯРЭЖЖА

А. С.

Так мала трэба
для тваёй маркоты:
лядок, імжа... Як млосна!
Сіні сад...

Таполі ўсе
з прылётнымі гракамі
стаяць азябла,
нібы ў лістапад,
звіняць заледзянелымі
ствaламі.

Сінеча ціхая
ў сырым завулку.
І чутна ў доме ночы напралёт:
ідзе з вярхоўя ашалелы, гулкі,
б'е ў берагі
апошні крыгаход.

Плыве па шкле
вясенняя мярэжка,
сініца звоніць, холадна быллю.
І я губамі прагнымі лаўлю
твае «люблю!» —
як снег на узбярэжжы.

ЗДЗІЎЛЕННЕ

Святая ростань у бязлюддзі!
Хто там напярэдадзе мільгне?
Мо Русь пакліча у аблудзе,
кержачкай гляне на мяне?
Авохці мне!

У лодцы пратапоп упарты.
Сядзіць, закуты ў ланцугі.
Дождж надакучлівы, як варта.
Паводка б'ецца ў берагі.

Аб чым ён думае цяпер?
«Паўгалава стралецкі б'е.
Б'е ваявода — гнуцца плечы.
Але не веру у цябе
ўтаўкуць, ў роздум чалавечы.
А Муза? Тут яна, на стрэчы...

О ерась Нікана! О Нікан!
Куды лягчэй блышыны грай
у вежы на саломцы хліпкай,
чым у дашчаніку, бадай,
уночы вымакці да ніткі...»

Але дарэмныя старанні:
яго не зломіць рык ракі —
на гэтай ростані ў тумане
устане сонца на дыбкі,
бо слова ходзіць напрасткі...

І не маленнем, не маленнем —
гарэннем душы патрасі!
Благаслаўлёнае здзіўленне
прад Авакумам на Русі!

І, не сагнуты у палоне,
гарыць кастром трывожных дум,
так і не скораны да скону,—
мяцежны кніжнік Авакум...

* * *

Прад бярозай схіляю калені,
ствол шурпаты кранаю рукой —
асцярожна маўклівыя цені
на мяне набягаюць з бакоў.

Хай шчымлівыя пахі айчыны
нечакана нагоняць слязу —
асыпаюць на блуднага сына
шапаткія галіны расу.

Колісь бацька ў часы сенакосу,
каб сянцо яго шчасным было,
сілкаваўся ля белай бярозы
перад тым, як узяць асялок...

Вось і я, быццам воблак лятучы,
каля роднай бярозы стаю —
і галлё прахалодай гаючай
ахінае маркоту маю...

КУПАЛЬШЧЫЦЫ Ў НОЧ НА ІВАНА КУПАЛУ

Пырскі на бронзавых спінах,
пажары на спіны ўпалі.
Купальшчыцы бераг пакінулі
ў ноч на Івана Купалу.

І скрытныя ўзгорачкі вострыя,
і скалы — пад месяцам ззяюць.
У млявым падножжы вострава
купальшчыцы заміраюць.

Спляценнем карэння пачварным
папараці выступаюць —
і крыллем махаюць, і скарбы
бяскроўнымі ловяць губамі.

Праз ноч маладзік над вострававам
стаіць нерухома ў зеніце,—
і пырскаў грэшныя россыпы
ляцяць на ўзбярэжнае пліцце.

На пліты! На пліты адчайна
ўзлятаюць, як чайкі, калені.
Вачамі прычараваныя,
ляцім па імшыстых ступенях.

«Люблю цябе, любая, мілая!» —
дыханне шукае дыханне.
Абдымкаў гарачае крылле.
Маўчанне чуе дыханне.

ЗОРНЫ ВЕЦЕР

Апаліць твар мне зорны вецер!
Сцяжа качэўяў... Серп мячэці...
З арбы — гарачкавы пагляд,
яшчэ дзявочы...
Чараў чад...
О Азія! Табой па горла
сыты!
Нібыта
рык муэдзіна ў ветры горкі!
Шлях — пад капыт!..
І — грукат, зрынуты ў зеніт
на Байкануры. Зорны вецер
твар абвявае на дасвецці.
Я стаў смуглявы ад цябе,
сасмяглы. У тваім цяпле
звіняць ізноў сухія травы.
Чмель на танюсенькім сцябле
чуцён ажно пад Какчатавам...
Згараю полымем суздром.
Хілюся... Нукер Чынгісхана
(як чмель — стракаты) за бугром
зноў злосна гікне ў стэпе раннім,
зглушаючы ракетны гром.

ПАЛАНЯНКА

Грае ранне ў чырвоным стэпе!
Плёсы — вочы стэпавіка —
заблішчалі наўскос між стрэлаў
іван-чаю і аерка.

Там, адна ў цішыні адчайнай,
зноў з абрыдлай вады на пясок
паланянкай і палаўчанкай
прамільгнеш галізною ног.

Па мядзяных грудзях расцячэцца
вострым болем руплівы дзень —
гэта скваппыя вочы качэўніка
ноч трымалі цябе ў вадзе...

Не скарыцца зямля разбою!
У чорны ранак, у боль слядоў,
я ступлю туды за табою —
у аповесць мінулых гадоў.

Хай абдасць палавецкае поле
рыпам арбаў, пахам раллі...
Далей круціцца Скіфіі кола —
разбягаюцца кавылі...

III, ПЕРАПЁЛКА

Тут некалі грэчка мядова цвіла.
Буяла мядовая ў лузе трава.
І з песняй дзяўчаты ішлі да сяла.
І піць перапёлка прасіла:
— Піт-ва!

— Ой, пі, перапёлка, раса не сцякла!

Тут пелі ракіты ў пявучых ярах,
тут ластаўкі віслі на правадах,
тут бусел на цвінтары клякатаў,
тут строма стаялі самы па вірах...

І хлопец — ціхоня згубіў раўнавагу,
дзяўчынкай узрушаны ўшчэнт,
не стрываў:
ў капе каля грэчкі, ля бітага шляху,
мядовыя грудзі яе цалаваў...

— Ой, пі, перапёлка! Каб жар твой апаў!
І знічка
        слязой па нябеснай сінечы
прабегла, скацілася ў грэчку, на шлях.
І ён быў расінкай у квецені грэчкі,
яна ж — перапёлкай у моцных руках!
— Ой, пі, перапёлка, ў мядзяных начах!

ЧЫРВОНЫЯ БУСЛЫ

Рабінавай ночкай жалейка пяе.
Маленства сваё прыгадаў нечакана я —
жыхар паднябесны Палесся
ўстае
на белай таполі, у неба ўчаканены.

І ранак чырвоны над белым буслом —
спакою няма яму — нема заходзіцца:
клякоча маленства, трапеча крылом,
вось рэха яго да Урала дакоціцца...

Ляцяць і клякочуць, знікаюць буслы,
пакінуўшы мне успаміны інакшыя:
блакаду, палескія нашы лясы,
таполі у багну... Не — ў сэрца, упаўшыя...

А тая, што стала ратункам маім,
кубло падзяліла са мной партызанскае, —
гайдае аблокі, як колішні дым
Айчыны далёкай,
над стромай уральскаю.

* * *

Паставога паўночная скруха
і матора прыглушаны гул —
кругласутачны каравул
твайго пільнага вока, акруга!

Станьце ўсе, ўстаньце ўсе
ў баявой навальнічнай красе!

Ўстань, гатовая для кідка,
ноч, гарачкавая смуга!
Ноч таемная, як тайга,
шлях у цемры... На зброі рука.
Насцярожаная тайга...

Старт ракеты і старт радка!

СНІЦЦА МАЛЕНСТВА

Сыну Сашу

Я ляжу ў сырой зямлянцы —
і праз верх вады ў бляшанцы.
Гук разведчыка (маўчок!)
столь свідруе, што ваўчок.

Зверху — кап ды кап. Макрэча.
Засынаю. Хоць укленчыў
лес (наўкруг стаяў сцяной),
ды спрачаецца са мной.

Я лячу — і вецер метка
хвошча ў вочы. Побач хвой
зоркі, вечнасці манеткі,
кружаць, як пчаліны рой.

Гэта — сон. Але — плыву.
І трасірак злыя кулі
швом смяротэльным сіняву
шыюць тут жа...
 Мне кашулю...
Строчаць. Толькі я — жыву.

ГУЛЬНЯ

Зноў форварда мяч наўскасы
ўрываецца ў памяці сетку.
Футбольнае поле маленства
свае падае галасы.

І цютчаўкі снег растае —
і лёгкае пары мярэжка,
як мройны міраж па-над рэчкай,
знікае і зноўку ўстае.

І свішча вятрыска кірпаты
ў два пальцы, каб чутна было! —
выпраствае бусел над хатай
сваё маладое крыло.

А я задыхнуўся ад бегу,
ў бязважкасці нейкай лячу
насустрач і свісту, і смеху —
жывой перашкодай мячу...

Ды форвард мяне апярэдзіць.
Ў сляпой крутаверці на гол
упаў ён — і грымнула смерцю
футбольнае поле наўкол...

А тыя, хто [illegible] вогненнай вёскі,
успомняць яе дзірваны.
Ды выбухаў злых адгалоскі
мне з той далятаюць вайны...

Дык смейся, мой хлопчык малы,
гані у вароты галы...
Ты — вёскі ўцалелая вестка,
якую на крылах з маленства
у сёння прынеслі буслы.

АХ, ЛЕТА, ЛЕТА!

Ах, лета, лета! Што за лета!
Цябе ў бярэма хоць бяры —
ты пахнеш кменам, санцацветам,
расой крамянай на зары.

Ты шчокі мне шчакой ласкочаш
на зялёненькім мурагу.
Ты так рагочаш, так рагочаш,
што я смяяцца не магу.

Ах, зорачка, заранка, дзеўчына!
Нікому ты не гавары,
як на стажар'е наша ўвечары
упалі лебедзі з гары...

Заранкаю ў духмяным леце
каханае святлее твар...
Ляцела песня —
                    на дасвецці
асыпала на ганак жар...

ВУЧЭННІ

І пыркі,
і іскры,
і травы — у твар...
І я расхінаю наўкола
бор карабельны, зыбкую твань.
Што гэта? Над сопкамі — золак!

А сосны з шыханаў
страляюць ва ўпор.
Звініць у вінтах перагрузка:
прастуджана чыхае дызель-матор...

І вось —
вылятаю на бруствер,
на пункт наш апорны,
на ротны рубеж
(мы так інсцэніруем войны)...
У сэрцы такі заклякоча мяцеж,
што самі спяшаюцца ў ранішні верш
бунтоўнага полымя вольты.

НА МАРШЫ

Пыл, як попел, па-над палком.
Пыл на піхтах, на мураве.
Пыл на сцежцы, на галаве.
Пыл удушлівы. Пыл наўкол!

І дарога двайной пятлёй
агінае гранітны скат,
абрываецца ўніз змяёй.
Пыл скрыпіць на зубах у салдат.

У нетры ўкручваюся, іду —
нахіляецца гарызонт,
сосны, возера.
На ляту
захлынаецца песняй дрозд.

Так, сасмаглы, іду, іду —
расхінаецца небасхіл.
Асыпаецца на ваду
пыл.

Ля міражнага возера ўздоўж
стыгнуць погарбы даўніх магіл.
Хай чаканы ды спорны дождж
прыбівае — кулямі —
пыл.

БЕГ ЧАСУ

О імёны!
Як сонцы ў зеніце...
Дзе вы зараз, імёны,
скажыце?
Точаць воды пясок,
што сцякае з размытае кручы.
Поўдзень.
Цені ўстаюць на насок,
каб у вір
даць нырца
немінуча...

КАЛІ КРЫЧАЛІ ЖУРАЎЛІ...

Калі крычалі жураўлі —
ці помніш ты, як пакідала
хваль прыбярэжная навала
у вочах шалу крышталі?

Калі крычалі жураўлі —
мы па іржэўніку блукалі
і забыцця траву шукалі,
як быццам па рацэ плылі...

Калі крычалі жураўлі —
мы вечнасць слухалі над намі.
І... двойчы ў тыя ж воды Камы —
ім збегчы ўдалеч — увайшлі...

* * *

Што ў памяці? Дрогкія шыбы.
Інтэрнацкая мокне душа.
Дабралюбава вуліца — нібы
між табою і мною мяжа...

Невадамі забыта вісела
на вяроўках бялізна, ліства.
Цераз вуліцу грала і пела,
і плыла навальніцай Масква.

Ад халоднай вады задыхаўся
наш
        табой перакрэслены
                                        дзень.
Навальніца сціхала — Масква ўся
ледзянела ў вялікай вадзе.

* * *

Чытаць біяграфіі польскіх паэтаў —
ісці лабірынтам к святлу запаветаў.
Гарэзнай усмешцы красуні ўсміхацца,
смяяцца — і грудзі, два яблыкі тыя,

тугія —
мядзяныя, наліўныя —
адчуць нечакана... Такія Гарацый
не помніў у Тыбуртынскім палацы...

Ах, лысы пракуда, ўладар летуценняў
пад засенню вабнай садоў Апалона!..
Качэлі імгненняў...
Усмешкі імгненняў...
не без вядомага польскага фону...

* * *

Не! Абыякава і проста
я не магу глядзець на подласць.
Дзе топчуць чалавека годнасць,—
не сведка я. Не крыж... а ростань...

А той, хто да крыжа прыбіты,
ён смела кінуў выклік ночы.
Крумкач значэлага нябыту
зніжаецца выдзёўбваць вочы...

На трасах, што крыжуюць кулі,
напішуцца радкі і строфы,
як гнеў Талстога.
Каб пачулі,
патрэбна гаварыць з Галгофы.

ЕЛАБУГА

Памяці Марыны Цвятаевай

Елабуга — гронкі рабіны
ахутаны інеем спрэс.
Тут свецяцца вочы Марыны —
марозам не схоплены бэз.

Над Камаю парк салаўіны,
і горад на двух берагах...
Стагоўі ў смузе... Кумарынам
на кожным з іх іней прапах.

Быў тут я. Пад лісцем увішным
дарэмна шукаў дзівасіл...
На цвінтары, сэнс свой згубіўшым,
ні ў парку,— не ўбачыў магіл...

Не ўгледзеў ні абеліска,
ні надпісу пра яе...
Тут вобраз з задумнасцю зліўся,
стаў інеем на траве...

І памяццю, ціхай, упартай —
зарніцы рабінавы бліск...
І чортава кола над паркам
спяшаецца — ўгору і ўніз...

НА РАКЕТНЫХ ЗАСТАВАХ

Над сабой, запацелы,
я трымаю увалы
і скалы,
як стрэлы.
Дзень і ноч пад зямлёй.
Нібы крот. Сам не свой.
Гул цячэ па суставах.
Перагружаная цішыня
на ракетных заставах.

Дзе мой дом? Вось мой дом:
хвоі ў строгіх спяцоўках.
Буралом. Буралом
над узлётнай пляцоўкай.

Гул ідзе пад зямлёй.
Нада мной —
ў сто накатаў лістота,
карані, травастой
ды бяссмертніка постаць.

Я праз сцены ангараў
бачу — ходзяць бяссонна
па кабельных капілярах
хмары грозныя ў сонцы...

ВЯСЁЛЫ КОНІК

Я выйшаў на стог на паўстанку
чыгуначным палатном.
У сена зашыўся. Да ранку
не прабярэ скразняком.
І раптам у сене — пад снегам —
драбнюткі, дзівак — «у траве!» —
стракоча, заходзіцца смехам? —
Не! Творы іграе свае.
Жалезінай бухае вецер,
на будцы чыгуначнай — сквір!
А конік іграе, смяецца —
над чым? Над сваім ліхалеццем? —
у кепцы сваёй набакір.
Смяецца над жудасцю клёнаў,
над снегам, над трэскам сухім.
Ён, конік, у лета ўлюбёны,
павек не развітваўся з ім.
І за спеваком тым увішным
у неба жаўрук узляцеў,
пад сонечнай хмаркай заліўся,
аж сівер суцішыў свой гнеў.
Пясок застракацеў пад кручай,
і гром пракаціўся ўгары...
Нібыта маланкай лятучай
мне конік жыццё азарыў.
Дык жыць! І трываць! За навуку
вялікае дзякуй табе,
маленькі пяюн і дакука,
цвыркунчык і ўцеха ў журбе.

ПОЗНЯЯ ЯБЛЫНЯ

Сястры Веры

Раптоўна да драбніц успомню:
суровы векапомны год,
дзьме ліставей — нішчымніц кроны
ідуць, як воблакі, ўразлёт.

Ляціць лісцё чырванапёрае
угору, ўніз — у белы свет;
трапеча на глухіх задворках,
агніста замятае след.

Мы галадаем. Хлеб з паловы
ляжыць, як под, і я штосіл
у раніцу бягу нанова
пад яблыневы небасхіл.

Якое шчасце ў познім лісці
жаданай весткаю жніва
убачыць яблык на галінцы,—
аж пойдзе кругам галава!

Я падаю ў сумёт чырвоны,
цуд заграбаю пад сябе,—
і яблыкі, як зоркі з кронаў,
мігцяць на восеньскай сяўбе.

Дык дзякуй, яблыня, за мроі,
за жыватворны твой падман.
Ты заадно была з дзятвою
аднавяскоўцаў-партызан.

ПАД МЕРНЫ МАРШ ВАЕННАГА АРКЕСТРА

Раптоўна ў грудзях сэрцу стане цесна,
калі пачую з плошчы незнарок:
пад мерны марш ваеннага аркестра
сівая гвардыя чаканіць крок.

Пяе труба, ўзлятаюць рукі мерна,
і кроку ў такт грукоча барабан.
Пад мерны марш ваеннага аркестра
слязу змахнуў рукою ветэран.

Галоўны ўдар прыпомніў падпалкоўнік,
Беразіну, Барысаў у агні —
і вецер бою зноў аблашчыў скроні
яму і мне, малому ў тыя дні.

На тварах — май і сонца Перамогі,
уральскі горад над лукой ракі.
Чаканяць крок. Не, марш спяваюць ногі —
ідуць, ідуць мае франтавікі.

Ім цесны свет, маленькая планета,
блакітная не праз касмічны дым,
здаецца, гэтай музыкай сагрэта,
вялікай стала Бацькаўшчынай ім.

АДБОЙ

На стартпляцоўцы зноўку неспакой.
Над лапікам таемнае зямлі —
ракет дэльфінавыя плаўнікі...
Над соснамі, шыханамі, тайгой
запеленгаваны жураўліны строй.

Ляцяць людзей малодшыя сябры —
вясёлы й бесклапотны трубны спеў.
Такі ж, напэўна, і пагляд з гары,
ў якім і сонца, й вершаліны дрэў.

Нібыта ўспышкі дыму пад крылом —
аблокі... Засяроджаны важак.
Ані і не зважае ветралом —
дзе б сесці чарадзе яго няўзнак?

Вясны чаканай вестка, звонкі ключ,
як мае быць, трымае курс... Пакуль
сціскае роздум неба і зямлю,—
ёсць і ў мяне надзея на тайгу...

Ані не збыцца
памылцы!
і — гарачынёй
зноў патыхае ад бяссонных хвой.
Гудзе у іх ахрыплае: «Адбой!»

НА КРУЧАХ

Раней, чым усміхнуцца мірна
ўваскрэсенаму сонцу на ялінах,
на дожджыкам размытым жвіры,
на сумнае й чырвонае шыпшыне,
на згубленае вопратцы змяінай,—
задумайся, прахожы!

О, голы конскі чэрап у падножжы
абрыва! Мроіцца ці ўсё наяве:
з лугоў зялёны вецер хвошча, свішча,
ў вачніцы лезе ў жудаснай праяве,
чуваць здаля, назойлівы, увішны...

Так стрэмканыя ў сэрцы. Не заглушаць
боль гэты хвалі й чараты унізе.
О, гэты чэрап! Выплюхне у вушы
ён стогны чаіц і прыбою пырскі...

* * *

Трымцела на пяску маранка,
і валасы цяклі наўплаў.
На імені тваім, Марына,
нібы на водмелі стаяў.

І мора не тапіла тайну,
губ затаіла вугалкі,
і твар ахутала туманам,
і белай пенаю — пяскі.

Пайшла, не глянуўшы ні разу.
Я слова кінуць не паспеў,
нібы няскончаную фразу,
я нёс цябе, як хваль напеў.

Вакол пагойдвалася мора,
і вецер прыбярэжны нёс
клубы, і стан, і два пагоркі,
і валасы ў накрапах рос.

ЗНАК

Дзе тут Кама, дзе Чусавая —
невядома. Рака якая —
не падкажа хвалі узор,
а падкажа сасновы бор.

Сосны стромыя па пагорку —
баявы ярмацкі дазор.
Ні плаціны пакуль. Ні мора.

Скачуць стругі па Чусавой.
З непакрытаю галавой
сам Ярмак стырнавы пад скалой.
Стругі — цішай. Бліжай Сібір.
Атаман чытае псалтыр.

Круцяць ямы, нібыта трэску,
човен, вырваную сасну,
як сякеру кідаюць дну.
Атаман не знаходзіць месца.

Стругі строгім ідуць ланцугом.
Крые ноч варанячым крылом
небасхіл і на схіле зорку.
«Казакі, падналяжам рабром!»
Трэск і лямант! На хвалялом
наляцеў атаман папацёмку.

«Жартаваў, атаман, з агнём!
Жартаваў, атаман! Не на Каме...»
Струг пярэдні разбіўся аб камень.

Ранне ў соснах на Чусавой.
Ен жывы. Толькі — сам не свой.
Абсыхае. Голаў — на грудзі.
«Вось адплата мне за разбой,
што ўчыніў і югры, і чудзі!»

Хлусіш, знак! Брэшаш, лёс-зарок!
Я яшчэ на Сібір хадок...

Ярмака цяжкая дзясніца —
анічому з ім не адбыцца!
Што там будзе — не важна пакуль.
Гэй, раз'юшанасць, дай руку!

Паглядаюць на Ярмака
з вышыні, з вышыні высознай...
не падкажуць ужо, не падка...
Ах, жуда... анічога сосны...

А на ўсходзе зарніцы гушкаюць
човен, смеласць тваю, атаман.
Праляцела чорная птушка
мо на камень, мо на шыхан!

ПЕРАДЗІМ'Е Ў ПЯРМІ

Міколу Рыскаву

Што за восень? Што за восы
закружыліся ізноў?
Што за белыя дзівосы?
Снег у верасні пайшоў?

Снег на дрэвах, снег на раме,
снег — куды ані зірні:
на саборы Кафедральным
і на камскай быстрыні.

Хмары чорнымі бакамі
(ў іх прамень апошні знік)
тушаць бакены на Каме
і кіруюцца ў зеніт.

Снег — на хмары, тратуары,
на чырвонае лісцё.
Кружыць снег, бінтуе мары,
снег на сэрцы... Забыццё...

* * *

Пяць каласкоў маёй Радзімы,
жытоў палескіх, узышло
над Камаю, што, як ільдзіна,
ў пакой праменіцца праз шкло.

Ці мо як шабля азіята,
дугою выгнута, блішчыць,—
ягонай сквапнасцю пагляда
кідаючы у няманіц...

Пяць каласкоў маёй Радзімы —
над горам, тлумам — над усім:
над Камаю, што, як ільдзіна,
не растае ў акне маім...

ЦУР!

Ты азірнешся, змоўкнеш
і прыпадзеш ка мне —
ўсяго сусвету вокны
цемрадзь ахіне.

Нялашчаныя вусны,
гарачыя, знайду —
сваімі дакрануся
на шчасце, на бяду...

І — гул крыві — аглухну
ад грукату ў грудзях —
выратавальных вокнаў
не адшукаю! Жах!

«Ой, цур! мы не дабеглі
да мэты...» — з твару хмур
злятае... Тоне ў смеху
твой хітраваты «цур!».

Гады — лавінай снежнай,
ды зноў вачэй прыжмур
ласкавы і ранейшы.
І хітраваты «цур!»...

СТАНСЫ

Ціпаюць бары прадвячэрнія,
маланкі — як немыя крыкі.
Спрадвечнасці чэзлыя цені —
на чэрні нябеснае кнігі.

У сон адыходзіць горад,
ускрык патрывожанай птушкі.
І прысмак свядомасці горкі,
што мог не ўсачыць, невідушчы,
зару-зараніцу над пушчай...

Ды не! Ўсё паспела застацца
галінкай маланкі ў аконцы...
Як мова,
як слова,
як стансы
на гэтай вось белай старонцы.

СЕНАКОС

Раздольна вачам і рухам,
і светла ад плечукоў.
Стаіць гамана над лугам —
віруе салёна кроў.

Шалеюць агні Купалля
у сэрцы тваім і маім.
І папараці, як пальмы,
варушаць лісцём цяжкім.

Трывога варожыць на шчасце.
Ці будзе яно калі?
І грудзі кругляцца ў адчаі,
і вочы — як вугалі...

Ці бачылі — гэта да слова —
як на таемнай вярсце
лілова-сіне-ружовы
над ярам верас цвіце?

То выгук сарвецца з кручы.
То чуецца — «жых ды жых!».
І сэрцу да слёз балюча,
і соладка ў гэткі міг.

КАНЦЭРТ

Помню клуб наш вясковы
ў дрыготкім святле.
Баяніст у вайсковым,
быццам бог на сяле.

Ой, заплач, перапёлка,
на канцэрце ў жыцце!
Можа, ў гордай анёлкі
хоць сляза упадзе?

Беллю сцелецца сцежка
у блакітным ільне.
Трэці лішні на ўзмежку.
Долу голаў ён гне.

А баян грае-вяжа
спелы лён, спелы лён.
І пра што толькі кажа
мне, самотнаму, ён!

Я і сам зараз граю,
аж пра космас пяю.
Ды заўжды ўспамінаю
пра каханку сваю.

За гарамі-лясамі
загубіўся райцэнтр.
Што ж у сцішанай зале
той не моўкне канцэрт?

* * *

Стагоддзі будуць падаць зоркі
і нараджацца будуць зноў —
на курганы, вышыні, горкі
святло струменіць і любоў.

На курганы, дзе паўшых горыч
(ці абеліскі, ці палын...),
стагоддзі будуць падаць зоркі;
і абуджаць
жывых спачын...

Прахожы! Сэрцам тут укленчы,
спыніся,
голаў да зямлі
ў самоце немай нахілі,
ўглядзіся:
зоркі йдуць у вечнасць:
хто — бальшаком,
хто — Шляхам Млечным...

СТАРТПЛЯЦОЎКІ

За калючкай КП, за дарогаю голай
ты даўно ужо быллём парасло,
толькі зноўку я чую твой голас,
інжынернае рамяство...

Чую тахканне ў кожным камлі,
чую сэрцы тваіх перасовак —
водар бітуму, мокрай зямлі,
водар дыму шугае з пляцовак.

Бачу твары сяброў ля кастра,
бачу магмаю ўздзьмутыя вены...
Што ж, давайце, Галоўны, пара,—
пачынайце франтоў наступленне!

Ўсю тэхзону, пачнецца ледзь-ледзь,
скалыхне грукат працы ударнай.
Маладзік, хопіць ноччу дурэць
над пустой афіцэрскай казармай!

А ў зацішку задумлівых хвой
толькі-толькі шарэе на ўгрэвах.
Там на плямцы зямлі векавой
заўвіхаўся разлік батарэі...

Колькі моманту ў сэрцы з грымотай
я на лапіку тым прастаю,
сэрца грэючы марай употай —
маладосць, можа, ўбачу сваю.

Можа, ўбачу айчыны гаі —
ў сэрцы земнага грому удары...
Я гляджу, як салдаты на гары
ля ракет, бы на пляцы ў страі...

Тут яны пад іглiцаю хвой,
у шурфах... Тут у шахтах — ракеты.
Прад вачамі апошнія метры,
што раўнуе бульдозер з зямлёй.

Тут, здаралася, ў лютую сцюжу
замярзалі ў палёце арлы.
Ніклай знічкай вайсковая служба
абрывалася ў шахту з гары...

Браўся моцай бетон... На паўсвету
галасіла завея... Ў палёт —
у бяссмерце — маўкліва ракеты
неслі сэрцы герояў работ.

НА ПЛЯЦОЎЦЫ ПРАЖЭКТАР ГАРЫЦЬ

Толькі галаў у неба закінь,
расхіні ўбок сасновыя нетры,
як у момант закруціцца сінь,
нібы ўкручваецца ракета
ў зорны купал. Паветра смыліць
ці галлё ад сцяжкоў ачаплення?
На пляцоўцы пражэктар гарыць...
Не! Нязгаснае прамяненне.
То загінуўшых сэрцы гараць
(служба скідак не мае, цяжкая),
на пляцоўку зялёная рацць
плашч-накідкі свае апускае.
Колькі раз жураўліны нарог
халадком абдаваў мае скроні,
калі курсам лажыўся на лог
з камуфляжам — разгалым у кроне,
з той гатоўнасцю нумар адзін,
з громам, стрыманым у сутонні,
што птушыны нястрыманы клін
мог парушыць няўзнак мегатонна...
Мог... Ды хлопцы — не прастакі:
днём і ноччу ля чуйных радараў
сцерагуць і паветра тайгі,
і зямлю ад магчымых пажараў.
І часцей на таежным зыры
я закідваю галаў у неба —
жураўлінае чую «кур-лы»,
кроны круцяцца слепа і нема.

ПЛЯЦОЎКІ І ПРАЛЕСКІ

Тайговы снег пралескай пахне.
Пралескі вочка без тугі
глядзіць наўкола. Хутка ахне
прад ёй насельніцтва тайгі.

Між сосен тракі транспарцёра
ужо напоўнены вадой,
і дызеля скорагаворка,
здаецца, блізка. За сасной.

За ёй, разлапістай, мядзянай,
такі ранейшы рытм работ
і ўсё ж інакшы — з катлавана
пляцоўкі сэрца
йдзе на ўзлёт.

ВАРТОЎНЯ

1

Па даху кроплі білі
памалей і мякчэй.
І рыпанне флюгаркі,
і ў цемры бляск вачэй,
яе ўжо не будзілі.

А зоркі — як цыгаркі,
Стажары, мусібыць,
упоравень з вартоўняй
гарэлі поруч з поўняй.
Здавалася, ўсё спіць.

Гром бахнуў нечакана,
і мы, яе дзятва,
паўскоквалі з «дывана»
(саломка ды трава),
як чэрці, апантана.

Захопленых знянацку,
нас трос сярдзіты гром,
у шыбы дождж запляскаў —
зноў здрыгануўся дом.

І ціша абступіла
дом, вершаліны дрэў,
навалу хмар скасіла,
бы хтось на літасць гнеў
перамяніць паспеў.

2

Мы глянулі ў акенца —
дыміўся біты шлях.
Ішлі па шляху немцы
з крыжамі у вачах.

Напаўраздзетых, босых,
па восеньскім сняжку
вялі іх — «Drang nach Osten!» —
дарогай на Маскву...

Мы плакалі, дрыжалі,
і беглі па шчацэ
слязінкі шчасця й жалю
і нечага яшчэ...

Заломіць час маланку —
і будзе зноў відна,
драўляная, яна,
як востраў лёсу ўранку,
што не ўзяла вайна.

ВЕСКА

1

Галчыным прывідным крылом
махае дах... Адзін... Другі...
І ўсе ўжо дахі над сялом
спіралі чэрцяць і кругі.

Ляціць у дзень наступны вёска,
спірае з горадам палоску.

2

Аўтобус «Гомель — Жлобін» млява
праз сем гадоў вязе дамоў —
і дзеўчына, з Жытоўлі мо,
ўступае месца мне ласкава.

Так-так, і я ужо «стары»
для апантанай маладосці.
Спяшаю да бацькоў у госці,
у хату нашу на зыры.

Туды, дзе дахі над сялом
тугімі крыллямі махаюць
і дзе мяне яшчэ чакаюць
мае бярозкі пад акном.

3

Будоўля хату акружае.
Тапчу бульбоўнік праз садок
я да вартоўні, што з дарог
мяне, напэўна, не чакае.

Там нехта, вартаўнік начны,
ціхуткай песняй гоніць сны.

Туды, туды — ў абдымкі дрэў,
у поціск рук, у бацькаў спеў...

ВЯЧОРКІ

Як зіхацяць маленства зоркі!
Па ўскаламучаным снягу
услед за бацькам на вячоркі,
па казкі, ў той канец бягу.

Нібы маленькіх дрывасекаў
спяшаю вызваліць з бяды —
бягу туды, дзе гурбы снегу
хаваюць хлопчыкаў сляды.

Не! Шчыра кажучы, на печы,
як той Ямеля, нацянькі
лячу да шчупаковай рэчкі,
ў лясок на свежыя пянькі.

Галін і ветру свістаскокі,
а мы не знаемся з бядой.
На санках на сабе здалёку
цягаем дровы грамадой.

На дол ад стомы бервяном
падчас упасці... Не! Бягом
у той канец на відавоку
спяшаемся усім сялом.

«У тым канцы» жыве Даніла.
Сляпы. Балака-знікністрах.
О! Колькі раз мяне сляпіла
ягонай лямпай па начах!

Да казкі я цягнуў заўзята,
як да святла, сваю далонь.

Не выпускаў з чароўнай хаты
няйнакш Паэзіі агонь.

Там з-пад рубанка, нібы дым,
віецца свежая габлюшка.
Плакат у хаце. А на ім:
«Устанем, крокам маладым
у камунізм рашуча рушым!»

На столі — кажанамі цені,
і чутны шолахі радзей:
Даніла з лямпай трохлінейнай,
ну як сапраўдны чарадзей.

Стары да жонкі: «Бульбу, Моця,
давай. Галодны я, як звер...»
І, невідушчы, як Гамер,
ён кнот навобмацак знаходзіць.

Ізноў ляціць у ноч жар-птушка,
і светла робіцца душы,
і вецярок гуляе з юшкай
у цвыркуновае цішы.

І так цудоўна жыць на свеце,
калі завея за сцяной,
і па сцяне шкрабецца вецце,
нібы вядзьмарка кульбай той.

Не! Перамога ўсё-ткі будзе!
Як ні страшыце, ведзьмакі.
І чутна, як равуць у Будзе —
у Кашалёўскай — цягнікі.

ВІД НА КАСЦЁЛ З ГАСЦІНІЦЫ «МІНСК»

Пацалункаў нячутны ўсплёск
ва ўчарашняй лістоце абраз
на маёліку бруку з бяроз
асыпае вятрыска штораз.

І лісцё, і ў пакосе траву
заграбае — грабцом грабе.
... Чарапіцай у сіняву
Мінск кідае выклік сабе.

ГРУГАН МОЙ, НЕ КАРКАЙ, НЕ КАРКАЙ!

Асенні дымок —буякі
(груган мой, не каркай зласліва!)...
І песнямі жніваньскіх івалг
дарога грыміць на бакі.

Праз пошум і ветру, і дрэў
(груган мой, не каркай, не цэлься...)
нясу я да сонца напеў
і пошчак журботнага сэрца.

Далей... Да сваіх... Да людзей...
Не каркай, журботная птушка.
Ты івалгі не заглушыш,
маіх не патушыш надзей!

ЯХТЫ З ТАІЦІ

Палец — атол Суворава
між астравоў.
Том Ніл — самотнік з норавам.
16 гадоў
жыве Рабінзонам —
за 70 ужо.
«Жыццё — за гарызонтам,
за той мяжой...»

Рана вятры здзьмулі
попел пальмавых лісцяў у акіян.
А ў лагуне — акулы,
купацца — ніяк...

Ліецца вада ў бочку,
ды не з вядра-руччa.
Дажджы тут ісці не хочуць,
дый бочка без абруча.

Ні ў карты згуляць,
ані ў даміно —
ў ладаштай хаце
нікога не відно.

Дачка ў Новай Зеландыі,
ў Аўстраліі сын...
— Не! Як яно ні ладна,
Том Ніл не зусім адзін!

То яхта з Таіці
сюды забрыдзе,

то руская «Каліста»
загойдаецца на вадзе...

Ліст праз вятрыскаў ворыва
дойдзе да Масквы;
штэмпель: атол Суворава,
Кука астравы...

— Скажу па сакрэце:
кнігу твару —
ў пальмавым вецці
лёгка пяру...

Сурова не судзіце,
як спыніцца шлях...
...Ветразь яхты з Таіці
бялее ў начах...

КАСМАНАЎТЫ

З імклівай платформы Зямлі
да зорак свой шлях пачалі.
Трывогаю бровы не хмур,
бывай, касмадром Байканур!

Утульная станцыя-дом
прымае ў абдымкі гасцей.
Пяе тут і ноччу і днём
зямных пазыўных салавей.

Між клопатаў нашых, турбот
бярозавым гаем дыхне,
і зоркі расой за сабой
павабяць — цябе і мяне.

Як быццам удвох па расе
сцяжынай маленства бяжым,
і пасвяцца коні ў аўсе,
і нам не паспець ужо к ім...

* * *

В. І. Церашковай

Па-над паводкаю наўсцяж
гарыць, не стухшы, пасак сіні —
берагавы пустэльны пляж
з вады ірдзіцца жоўтай глінай.

Стаіць знябожаны анёл —
бацян — на поплаве маленства,—
і гагатлівы крык наўкол
у засмучоным сэрцы б'ецца.

Не цьмяніцца з гадамі бляск
з палеткаў Бацькаўшчыны мілай.
І гэты бляск, і крылляў пляск
злюбіць, забыць не стане сілы.

НЯШЧАСЦЕ

Голыя ліпы,
адчайныя рыпы —
з маленства ў сёння
прыходзяць нібы.
Імжыць цэлы дзень
на двары азярына.
Пяе вадасцёк —
і рышток,
і рына.
Сяджу на акенцы
з надзеяй у сэрцы,
што маці адпусціць
на вуліцу сына.
Лічу каменьчыкі
пад шулом —
караблік камечу
пад дождж за акном.
А маці і рада б
мяне адпусціць —
ды як па макрэчы
у чунях хадзіць?
І думкі бягуць,
як вада ў вадасцёку,
у сорак пятым
далёка-далёка.
Цікава, ці ўбачу
я некалі ўсё ж:
па лужынах скача
на дыбачках дождж?

Імжыць цэлы дзень
на двары азярына?

Пяе вадасцёк —
і рышток,
і рына?

Сяджу за сталом
над белым лістом,
а маці збірае
на вуліцу сына.

А той не ідзе,
упіраецца Сашка:
хадзіць па вадзе
яму ў боціках цяжка.

Пачуў і ўбачыў
праз трыццаць гадоў:
маленства плача
маё ізноў.

ЛАГІ

Абоч ляцелі стрымгалоў ласі.
Ішлі мы проста на дрыгву і скалы.
Глядзелі ў ноч Палёныя Лагі,
ў лагах кастры трывожныя шугалі.

Мы паднімалі вочы (плыў пажар —
аж на паўнеба чырванню — з усходу) —
і моўчкі йшлі. Мы рушылі пароду.
Мы магістраль вялі цераз лагі і гар.

«Каханая!» — шаптаў мой друг.
«Каханая!» — ў адказ шапталі сосны.
«Каханая!» — тук-тук. Тук-тук.
Гучала рэха. І ўставала сонца.

А я маўчаў.
Па карце вёрсты і лагі злічаў.
Цадзіў праз зубы шэры змрок застаў,
і траў, і хвоі...
А ён не знаў.
Нічога ён не знаў:
ён жыў жанчынай тою.
Маёй любоўю.

ПАХ ВОСЕНІ

Пахне яблыкамі дзень
на праспекце, у гародзе,
ў садзе, ў лесе — ўсюды, дзе
залатая восень ходзіць.

Пахне яблыкамі ноч
на праспекце, у гародзе,
ў садзе, ў лесе, дзе ізноў
залатая восень ходзіць.

Дух мядовы, вечны круг —
спеласць, сталасць думкі, сэрца,
падрахунак, новы зрух,
крок наперад — у бяссмерце.

ВЯРТАННЕ

Шчэ толькі подступы да Мінска —
Бярэзіна, Беразіна...
Але праведзена ўжо рыска
паміж «сягоння» й «даўніна».

І хвошча вецер Белай Русі,
сплятае нашы валасы
на крапасной сцяне Бабруйска
каля бярэзінскай касы...

* * *

У сераду-сераду
я куплю сабе дуду.
Заіграю, запяю
пра каханую сваю.

Затуманіць белы свет
хмелю цвет,
каліны цвет.
Затрапеча нада мной
пёрца-воблачка
ліствой —
і пасыпле спелы дождж,
нібы яблыкі зарой...

Вось дык хвошч!
Спелы дождж!
Зараз будзеш ты маёй!

ЗМЯРКАННЕ

Стрыжы зразаюць край абрыва,
маланкай жыхаюць гулліва.
І там паўнеба разануць,
і тут шчабечуць, як на дзіва,
свой неспакой душы нясуць.

Ва ўсім якаясьці трывога,
бы час расплаты надышоў
за нешта... ў прыцемку дарога
нясе пад восень стрымгалоў.

Віна, як цень на сэрцы смутны:
не так любіў, не так спяваў...
І крылля росчырк каламутны
напомніць — блізка твой прывал.

Ну што ж, кажу сабе, цудоўна!
Дух неспакою, дух бунтоўны,
валодай светам, як стрыжы...
І зноў — за бураю пагоня
ўтрапёнай яраснай душы.

БУРАЦІЯ. ГУСІНААЗЁРСК

А з вагона — сіні-сіні
прыазёрны лес.
І ляціць касяк гусіны
мне наперарэз.

Трапяткім крысом халата
ахінае змрок.
Вока пільнае ў бурата,
сакаліны зрок.

Бліжай-бліжай крыл узмахі —
не страляе ён.
У бурата ўся увага —
неба ды вагон.

Як пад ранне задзімае,—
ветрана ўвесь дзень,
юрту поначы хістае,
чалавека цень...

Толькі юрта у бурата —
качавы вагон.
Крылаў свіст чуцён распятых.
Сон ці ява? Сон...

У пасёлак і — дадому,
промпляцоўка зноў.
Тут ці ў сэрцы, невядома.
Запытай сяброў.

Будаваў у Джыд-аймаку,—
новы інтарэс...
Гэй, у маладым размаху
Азярская ГРЭС!

Ён ідзе ў світальным дыме,
мой кунак-герой.
Будаўнік сваёй Радзімы
і сучаснік мой.

Мне ж далей камандзіроўка,
баявы загад...
Бачу і свае пляцоўкі
праз яго пагляд.

СУНІЧНАЯ ПАЛЯНА

У мужным сэрцы позна альбо рана,
як намітка сінечы на зары,
ў акрузе энскай, у глухім бары
успыхвае сунічная паляна...

Вось так і мне памроіцца наяве
той неспакойны для планеты час.
Шыхан — налева і шыхан — направа,
ну а паміж — ракетная застава,
наш дом — казарма, вайскавая часць,
у кроках трох — сунічная паляна.

Пасля работ надзённых і пасля
грымотнага, пустога катлавана
бліжэй за ўсё цнатлівая зямля
і асабліва гэтыя суніцы,
на ёй затоеныя аж да дня...

Прасторней ветру гойсаць між галля,
і лашчыць дол, маленькія зарніцы —
удвая...

А што, калі Яна! Дзяўчынка, яска...
А што, калі употай забрыдзе,—
нібы за сонейкам, за ёю краскі
галоўкі ўраз павернуць на градзе.

Вось так і мне памроіцца наяве:
ані на хвілю не сціхае бой
паміж святлом і цемраддзю. На Яна,
якраз купальскай ночкай трапяткой,
на стартпляцоўцы шугануў агонь...

(Раней крыху над соснамі, распадкам,
у сонечнай касмічнай вышыні,
быў службай нашай збіт арол-сцярвятнік —
чужы разведчык выжыў у агні.
Мы ж думалі — згарэў. Ані...)

На стартпляцоўцы шугануў агонь,
калі ў маёй была Яе далонь,
калі касцёр сунічнае паляны
над цягачом трывогі баявой
успыхнуў і затрапятаў у Ей,
пакінуўшы на вуснах боль крамяны.

Гарэлі электрычныя паходні,
мы занялі ужо рубеж зыходны
і рушылі, нібыта на вайне:
вось стартпляцоўку выбух здрыгане.

Так, мы паспелі з Ей. Паспелі!..
Дагэтуль па-за мной і ува мне
вагаюцца гіганцкія арэлі,
як маятнік. Туды-сюды. Туды-сюды.
І мы ляцім на іх. Удвох. Заўжды...

Свіціцца ўпадзіна праз піхтаў кроны,
палае на шыхане іван-чай,
а ў сэрцы чуйным смуткам улюбёных —
два словы тыя Горыч і Адчай...

Як боль, як незагойлівая рана
(гарацьь, гарацьь купальскія кастры!),
надзеяй, мне зусім неспадзяванай,
у абяцаным казкай гушчары,
у паўімгле трапеча кветка Яна,
на той паляне энскай у бары.

БЕЛЫ ЖУРАВЕЛЬ ПАЭТА

(Помнік Сяргею Ясеніну ў Разані)

Развёўшы крылы на адхоне строма,
ён утаропіўся ў аблокаў бель.
Ад роднае Акі да зор, вядома,
ляціць паэтаў белы журавель.

Там для яго душы знайшлося месца:
і ў навальнічным подыху вятроў,
і ў шэрым камені ўтрапёна б'ецца
ягоны сум, ягоная любоў.

Спяшаючы са светам на спатканне,
прашые далеч жураўліны ключ.
Адзін важак не паляціць у ранне —
без чарады застанецца ля круч.

Не верце толькі, што палёт закончан
тут для яго, што ён забранзавеў.
У промнях гэта злёгку. Днём і ноччу
ён падае з нябёсаў трубны спеў.

ЗАПАВЕТНЫ РАЙ

Пагодка, нібыта ў казцы.
Край — запаветны рай.
Гарыць вясёлымі краскамі
адвечных бароў іван-чай.

Каліны і кмену шаленства
тэхнічнае зоны наўкруг.
З тэхзоны, нібыта з маленства,
даносіцца дызеля грук.

О дым перасовак даўнейшы!
Не параўнаеш ні з чым...
На што ўжо жыхар я тутэйшы,
ніяк не звыкнуся з ім.

Таму мой парыў надзвычайны,
каб дым гэты плыў штодня.
У немагчымым маўчанні
не назіральнік я...

Будоўля натруджана дыхае.
І я — яе інжынер,
і дырыжор, і крыху —
рэвалюцыянер...

Таму мне і даспадобы
мой запаветны рай,
пад зоркай — мяцёлкі кропу,
на глінішчах іван-чай.

Мне даспадобы права
Эдэм гэты берагчы —
і мову яго, і славу,
і гром залыганы ўначы.

⋮

Зарукай — Урал, Чукотка,
і Беларусі свет —
вясёлая наша пагодка
над вастрыямі ракет.

ЛЕТА

1. Ясень

Зялёнае воблачка — ясень.
Круціцца на зыры,
у дня — і празрысты, і ясны —
балюе, як бог, стары.

Над неабдымнай прасторай
варочаюцца грамы.
Загадкавы вецер зорны
прыспешвае шар зямны.

Ляціць светлавокае лета
у шэрай касмічнай імгле,
у мітусні сусвету,
у часе, прасторы — далей.

Нібыта ўнутры вадаспада,
прыціхла зямля ў лістве.
І я, і яна — узняты
да блізкасці ў хараства.

2. Арэлі

З дажджамі, з зялёным шумам
здзяйсняем свой зорны бег —
і я, і яна — ў задуме,
у прадчуванні ўцех.

І цені бягуць палахліва,
і рукі ў руках назаўжды.
І ветразь касмічны імкліва
нясе — і няма бяды.

І смех нечаканы, і шчасце!
Арэлі — хутчэй! хутчэй!
Над плёткамі, над мяшчанствам
і над убоствам людзей.

І смех (і крык захаплення!),
ды так, што ў зіркастым акне
ўздых зайздрасці нечай укленчыў.
А чый? Невядома мне.

3. Праявы маленства

Шум сосен пад вокны прыйшоў —
у вочах праявы маленства:
гудуць самалёты ізноў,
і недзе грыміць па суседству.

Такой непазбыўнай тугой
у бомбавым сквіры і віску
агорне ў купелі лясной —
у ціхім распадку пад Мінскам.

То ягаднікі, то мох,
то папараць на паляне.
Купальскі перапалох —
мігне і пагасне ў тумане.

...І зноў ■ паўзу ў крутаверць
з біклажкай да мірнай крынічкі.
Пакуль жа няўцямна, што смерць
павісла на промені знічкі.

Нібыта стаяць за спіной
далёкія сілуэты,
знаёмыя твары — і бой...
і... абеліскі — ракеты...

Па небе аблокі лятуць,
прадвеснікі добрай пагоды.
Па небе аблокі лятуць,
а можа, пыліць пяхота?

ПАЛЯЦЬ ЛІСЦЁ

Яшчэ ў пачатку спелы жнівень,
але ўжо запар колькі дзён
у парку — на кастрах — тужліва
гарыць лісця вясновы сон.

Сюды, на бераг Камы, рана
прыходжу, тут свабодна мне.
Хай тленнай думкай нечакана
дымок спалення ахіне...

І схамянуся: Кама — побач,
зямная чэзне мітульга.
Што перад гэтай плынню роспач,
душэўны боль, твая туга.

Стагоддзяў роўнае дыханне,
грымлівы подых навальніц,—
не на жыццё, на смерць змаганне,
цябе ўздымае з няманіц.

Няхай бяда. Здавацца сорам.
Згарай, аджыўшага спакой!
З сябе здзіраю скуру,
ўчора
яшчэ пакутаваў з якой.

СНЯГІ ЮКОНА

Джэку Лондану

...І — рэдзенькі лес на Юконе самотным.
Над белым бязлюддзем, над хеўрай снягоў,
над пашчай ашчэранай зграі ваўкоў
ты страпянуўся, бясстрашны Джэк Лондан!

Іду да цябе я зноў прыцемкам сінім:
нясе акіянскіх сцяжын карагод,—
марозна-ласкавае слова Расіі
шчанём перакульваецца ў сумёт.

Адзін аднаго разумеем з паўслова —
віецца над нашым прыстанкам дымок.
І вухкае сыч у таросах.
Нанова
завея хавае самотніка крок.

З табой неаднойчы снягамі Юкона
мы пройдзем — адступіць кашчавая смерць.
І мужнасць, і прагу жыцця, і натхнёнасць
не зможа адолець снягоў кругаверць!

НАПРАДВЕСНІ

Бярозак цені на снягу.
Стаіць над гаем ночы стома,
вятроў неўтаймаваны гул,
і трэск, і грукат крыгалому.

Слізгоча, свеціцца ўначы
уледзянелая дарога —
грачыны грай над ёй гучыць
і будзіць смутную трывогу.

Вось-вось успыхне небасхіл,
зайграе чырванню імкліва —
і ўдарыць промень-дзівасіл,
разбудзіць сон прымоўклай нівы.

ГЕНЫ

Раўніна бяскрайняя, снежная,
халодная роўнядзь наўкол.
Галінка быльнёгу на ўзмежку,
былінка адзіная, ўрэшце,
кранае і сэрца, і дол.

Дарога, прыбітая часам,
прыбітая капытом.
Вялізныя хвалі, як дом,
варушацца — снежным галсам
ідуць на мяне напралом.

Вось ельнічак часты, купчасты,
маёй краявіны дубы
у веі, нібыта ў пашчы,
знікаюць. Ад снегу сляпы,
іду напраскі — вершаліны
спраўляюць хаўтуры па мне.
Ды не. Вунь агеньчык адзіны
мігціць у далёкім акне.

Марозны убачыцца вечар,
дарогі танюткая ніць...
Касмічнае эры завея
у генах маіх зашуміць...

І я, нібы бацька, дадому
(наўкола бушуе вайна)
іду — і не ведаю стомы,
і вёска агнямі відна...

* * *

Жудасная развязка —
камусьці яна па душы:
мыс Кенэдзі і Аляска
дымяцца на рубяжы...

Гатоўнасць Адзін у свеце —
у прэрыях, у тайзе...
На валаску
планеце
вісець
у зорнай смузе?..

* * *

Цяпер там Памяці адвечны бор шуміць,
прадзе туман вячэрні ніць
асенніх павуцін над плёскатам крыніц...
Шаўковая трава, і сон-трава, і забыцця трава,
звяры і птушкі — крыкі іх чуваць,—
у рэсе тым, якое не дагнаць...

І памяццю спяшаюся туды:
там — сіні верас. Зорка над капцом.
Гарыць і не заходзіць над хлапцом.
Пагода, дождж — лясы звіняць заўжды.
Па лісцях, травах трызніць зоркапад...

Між зор Зямлю убача касманаўт —
пачуе: дождж шуміць і хвошча град...

* * *

Гарачь лясы!
Гарачь лясы Палесся,
арэшнікі і сасьнякі.
Цячэ смала,
цячэ смала на верас,
на верасень і на пяскі.

О, дзе ён,
дзе, маленства свет?
Лясныя водары і гукі?
Ані няма — прастыў і след,
і ў сэрцы — горыч, боль разлукі...

То дым ахутаў верасы,
дым Белай Русі —
у Расіі...
У прамянях
гарачь лясы.
Цячэ смала
на верас сіні.

ЗЯМНЫЯ ЗОРКІ

Я вочы заплюшчу — над гронкамі кмену,
над гранямі скалаў, нібыта ў сне,
хістаюцца кедры — і Пояс Каменны
ляціць, аддаляецца ад мяне.

Павее з пляцоўкі і дымам, і чадам —
і зоркі зямныя (ракет цягачы
узяты ў сцяжкі і ў ражкі аўтаматаў)
на ўзвод ачаплення глядзяць уначы.

Пачую, як сэрца пайшло пачапічона
пад гімнасцёркай, ад сонца рудой:
нібыта другі ў лейтэнанцкіх пагонах —
не я ў ачапленні — махаю рукой...

СМЕРЦЬ КАМАНДЗІРА

Не вярнуўся палкоўнік
з пярэдняга краю,
не пайшоў каля белых бяроз,—
на лафеце
ў бяссмерце
Валдаем
правезлі — і не ўранілі слёз.

Суха трэснулі залпы —
і сцягам зялёным
ахінулі бярозы адчай.
Сто бялявых ствалоў
адсалютавалі палкоўніку
на заставе імя Ільіча.

Па гудроне,
ўзрываючы далеч маторамі,
ішлі павольныя цягачы.
І закрытыя, пад брызентам,
зоркі —
камандзірскія зоркі
праплывалі ўначы.

РАБІНАВЫЯ НОЧЫ

Ах, ночы увосень!
Над Белаю Руссю
гуляе рабінавы вецер.
На плёсах гагочуць
вясёлыя гусі —
і крыллямі хвошчуць па сэрцы.

І дождж не ідзе.
І зарніцы трапечуць.
Блукае па голлі світанне.
І ходзіць па голлі
нябачаным смерчам
маёй нарачонкі каханне.

Паводка святла заравога
на бераг
ляціць і шуміць нада мною.
Да дня мне іржышчам хадзіць
вастраверхім,
бялявым ад позірку поўні.

А гусі гагочуць — іх крылляў узмахі
даносяцца з Белае Русі.
На Урале пачую — над бацькавым дахам
ляцяць азіяцкія гусі...

ВЕРАСОВЫ СВЕТ

Свет верасовы прад табою —
тапчы, вайсковец, сум-траву
перад зарой, як перад строем,
трубі ў трывожную трубу.

Гуляе рэха ў соннай пушчы.
Над ёю ранак заіграў:
таварыш, з подзвігам заручаны,
бяссмертнікам ківае з траў.

І ў сэрцы боль. За гэтым болем —
ні траў, ні сонца, ні зімы.
Нямыя зарывы над полем,
навіслі белыя дымы.

БЛАКАДА

І «юнкерсы» гудуць, і «фокке-вульфы».
Над галавой вісяць і ныюць, як чмялі.
Нібыта ранены ў нябёс завулку,
я наталяю смагу на зямлі.

Не, як жа на зямлі, калі карэнне
над галавой ад выбухаў дрыжыць!
Я шорсткім языком ліжу бярвенні.
Я падстаўляю рот пад капяжы.

Блакаду прарываю аж да ранку:
ані злічыць начэй, што будзіць бой!
Макрэча павучыная зямлянкі.
Трывожных сосен шум над галавой.

І думкі тлумныя, і сам ад болю
кідаюся — світальная пара...
І маці — міласэрдная сястра —
мяне ўзнімае на руках да столі,
каб я напіўся... Не было й вядра...

«Папі, сынок! Павінны ж мы трымацца.
Ты, як салдат. І ваяваць гатоў...»
А міласэрднай — крышачку за дванцаць,
а «раненаму» — пяць гадкоў.

Калі дарослага аглушаць болем
знявага, здрада,— ўспамінаю бой...
Вязі, вязі мяне, вайны двухколка,
ў лясныя сховы — ў партызанскі бор!

КАМІЛА МАРЦІНКЕВІЧ ЕДЗЕ Ў САЛІКАМСК

Прыстанак у турме губернскай. Зноўку —
у перасыльнай ноч... ізноў — далей, на поўнач...
Астрогам Мінскім здаўся Кафедральны
на скрыжаванні завірух уральскіх...
Завеі гул — не моўкне, як паўстанне —
сябрам, Каміле... на цярністае дарозе.
(Стукочуць капыты, рыпіць аб снег палоззе.)
Жыццё выгнанніцы — на міг здалося —
ты чуеш, бацька? — падалося лёсу ласкай...
Праз тыдзень стрэнуць копі Салікамска
і чыстыя, бы ў Русі Белае, бярозкі...

БАЛАДА ПРА ПАМЯЦЬ

За глухой цвінтарнаю сцяной,
у зацішку ля манастыра,
голас маці прагучаў з-пад хвой:
— Памяніце воіна Пятра!

Сосны спрэчкі тут вялі аб ім
у цішы шпітальнае, калі
ў сорак першым чорных свастык дым
поўз на беларускія палі.

На пліце пад абеліскам
шызы мох
ля прытомленых салдацкіх ног.
Песню соснаў слухае салдат,
ён дамоў не вернецца назад.

— Памяніце воіна Пятра!
Колькі часу гору!
У нябыт,
з дзён грымлівых ніцая вярба
нахіляе голле на граніт.

Прашумяць навалы над сцяной,
адмігцяць маланкі.
Быццам цень
Маці Памяць, як калісь на бой,
паўз магілы пройдзе ў новы дзень.

* * *

Гарацъ кастры. Вянкі ў вадзе
плывуць — не тонуць.
(Дзе ж ты, дзе,
мая купалінка пярэсна?)
— Я тут, Іванка, ў хвалі чэзну...

Глыбокі бор — і пасмаў цень
кастра на рэчку, на паляну.
Мы — басаnож па-над кастром.
У вочы — вочы. Смех і гром!
І нехта, дзіўны, галяком —
расой...
— Ой, рана на Івана!
...Ішла сялом,
прыкрыўшы вочы рукаўцом...

ТАЕЖНЫЯ АНЁЛЫ

На верталётах прыляцелі з неба.
Кранулі грэшную зямлю нагой.
Таежныя анёлы — інжынеры
навечна парадніліся з тайгой.

Ідуць у спёку і ў мароз адчайна,
я — пачатковец, дылетант між іх.
Нібыта сосны векавыя — тайны
на стартпляцоўцы гушкаюць усіх.

Рыпяць масніцы у пустых казармах,
калі ўзгуляе дзесь паблізу гром,
бо інжынеры й зорнымі начамі
не пакідаюць свой ракетадром.

У справе зорнае не дылетанты,
і прад Зямлёй не задзіраюць нос.
Таежныя анёлы — лейтэнанты,
мой зорны час, мой шчаслівейшы лёс!

РАЗВІТАННЕ З ТАЙГОЙ

Бывай, тайга! Галодны беркут
ужо не кружыць нада мной.
Хаваю ў сэрцы паняверку
я на самоце з цішынёй.

Бывай, нагор'е! У зеніце
галіны з шыгаллем трымцяць,
а мо галёкае: «Дабрыдзень!» —
мая Ядлоўцавая Падзь...

Мне замаркоціцца. Я знаю
імглу цяжкую, мёртвы зыб,
трывогі на пярэднім краі
і цішыні раптоўны ўсхліп.

Будоўлі і ракет гатоўнасць...
Удзячны лёс, ракет кідкі —
а ці не ўчора хмараў коні
ў тайзе ўставалі на дыбкі?

Было ўва мне ўсё гэта — будзе!
Ізноў над краем франтавым
па-над ракетамі ў бязлюддзі
віецца Бацькаўшчыны дым!

Кучер
Залу

2

ПЯРЭДАДЗЕНЬ

1

...Сэнс у табе, у асабістым.
Як сам ліхач у полі чыстым,
Елагін востраў,— і ліхач
імчыцца вострвам наўскач;
у санках — Блок;
Паэт імчыцца!

І храп каня, і шамаценне
пад футрам шоўку, й палазоў
па снезе хрумсткае рыпенне,
і за санямі — цені, цені,
і гукаў бег у летуценні
сярод абуджаных лясоў.

І ўсё. Вы чуеце Эпоху
на тройцы ўзмыленай.
І Блока.
І ўсё — паэзія, натхненне,
і ўсё — не проста санак бег,—
жаданне, думкі і сумленне.
Нямала гэта. Гэта — век!

2

Жыццё — такая карусель,
нясе да вечнасці па коле,
не выскачыць з ключа падзей,
не збегчы ад зямной юдолі;
мкне да пачатку, ў небыццё!
Шуміць пад флюгерам вяртушка —
вычэрчвае па кольцы птушка...

Такая карусель — жыццё:
што хочацца,
з яго не выбраць,
і непатрэбнае табе
ў нішто не кінуць, сам сабе
рыхтуючыся ў доўгі вырай...

Але... у кожнага употай,
падспудна, ў дыме — вечны рух:
Любоў, Надзея і Свабода —
і размыкаецца ланцуг...

Звыш волі ў кожным нешта ёсць,
што насупор яго жаданням:
дурман чаромхавы уранні,
ці жаўруковы спеў кахання,—
ці вестка з ніадкуль, як госць...

Вясна і восень — так спрадвечна...
Ступае поступам сваім
Час-Гаспадар, шлях небяспечны
адмерваючы ў гром і дым...

КОЛЕР ЧАСУ

1

Празрысты пермскі лістапад.
Казармы. Поўдзень. Б'юць у шыбы,
як і даўней, сто год назад
екацярынінскія ліпы.

Вартуе Вышка даль зямель,
грукоча гром над камскім плёсам.
Ізноў палат шпітальных бель
паўсюль нагадваюць бярозы.

Смуткуе дужа сёння ён,
паэт. У чырвані прырода.
Ўсплыло салдацкаю крывёй
жніво шаснаццатага года.

Гуляе смерць наўсцяж па Уралу:
мор у Астрожскім,
гвалт, разня.
Ва ўпор салдатак расстраляла
ля манапольні казачня.

Тут не наблытаў правакатар,
ва ўправе прыстаў не збрахаў.
«Страляць!» — загад свой губернатар
уласнаручна падпісаў.

2

Што будзе ці было,— далёка:
франты сусветнае вайны
і грамадзянскае — відны,

як Абаянь,
пад Курскам вёска.

Праз многа год у Мінску мне
ў жалобны жнівеньскі світанак
жалейка раптам запяе,
твая «Жалейка», брат Іване...

3

Па шчодрай восеньскай сяўбе
ідзе паэт — прастор наўкола.
«Удач табе, Якубе Колас!» —
ён шэпча ліпам і сабе.

І зноўку гусі з Белай Русі
нясуць ключы над барвай дрэў.
І паўтарае сэрца ў скрусе
айчыны любае напеў.

Нахлынуць толькі успаміны —
і заспявае сэрца ў лад
не з тылавым, не з каранцінным —
з акопным тупатам салдат.

Ён зведаў многа-многа ліха
казарменнага
дзень за днём.
Зноў толькі ліпы, толькі ліпы
нагадваюць бацькоўскі дом.

Ад ліп нясе мядовым пахам.
Ідзе Якуб — пад шынялём
душа,не ведаючы страху,
у неба рвецца журавом.

А лісці гінуць бедным людам
тайгі аглухлай на зары.
Іх акрываўленыя груды
гарадь журботна у бары.

А хто аплача невядомых,
сум да магіл іх прынясе?
Мяцежны вецер каля стромаў
шуміць, складае спеў тайзе.

Вы чуеце у песні гэтай,
айчыны верныя сыны,
салдаты волі і паэты:
супроць сусветнае вайны

ўстаюць байцы, вядзе іх Ленін
пад сцягам,
што гарыць зарой.
Старога веку нікнуць цені,
ірдзее золак над зямлёй.

Надзеі песцілі не марна.
Дзень новы выплыве з імжы —
і бура грымне у казармах,
якою кожны змалку жыў!

ЯДЛОЎЦАВАЯ ПАДЗЬ

1

На глухое дно ў хмызняку,
ў донны глей ля праточных вод,
дзе ядловец цвіце ды баркун,
апускаюцца казкі з хвой.

Апускаюцца ціха ў аер,
цені гойдаючы спакваля...
— Ці не ты гэта, мой інжынер?
Лейтэнант адказвае:
— Я!

Точна так. Зялёны яшчэ
(так, у леце знік ледастаў,
так, зялёны пагон пячэ,
непрывычна пячэ...) з застаў
я імчуся ў зелень вачэй,
ў шэпат вуснаў тваіх і траў.

Што гаворыш, не ведаеш нат:
— Ці не ты гэта ў добры час?
— Точна так... Сустракай, лейтэнант,
папаўненне у вашу часць.

Памяць сэрца? Тайна-рака,
не за трыдзевяць ты зямель:
закружыла, ўзяла тайга,
быццам завязі першай хмель.

Востра ў твары біў гліназём.
Сэрцы біліся, як адно,

асвятляючы шчодра ўсё:
і Сусвет, і Сусвету дно.

Ў галалёд, у куржак, у туман
не змаўкаў — грукатаў
катлаван...

2

Мы кахалі. Мы бачылі свет
думак нашых і мройных сноў —
нас знаёміў дваццаты век
і навек разлучаў ізноў.

А ў любві, інжынеры Зямлі,
у Ядлоўцавай Падзі той
мы ўявіць сябе не маглі
на самоце — самі з сабой.

3

Застаялай спякотай у гаць
між лістоўніц і кедрача
поўз бялявы туман у Падзь,
а за ім з гор паток журчаў.

Многа вёснаў з тае пары
з гор сцякло, ды адна пяе:
у струменістым танцы на ўступе гары
я ўгледзеў постаць яе...

Доўга там вяночкі пляла,
так, гарэза, дурэла між скал,
што паток сяміцветны святла
стан пажадліва абцякаў.

4

Па душы быў казарменны быт
пад бязлітасны бег хвілін,
на пляцоўцы курыўся пыл
па гатоўнасці нумар адзін.

Гул трывогі ляцеў ад зямлі,
ад таежнай сцяжы.
Дзеці войнаў, мы не маглі
гэты гул заглушыць у душы.

5

Выбываю ў другую часць,
пакідаю самотнаю Падзь.
Нам ужо не сустрэцца з табой:
будаўнік і казачнік твой
зноў не прыйдзе сюды вясной
пад зажураны гоман хвой.

Толькі дзеўчына без мяне,
без мяне на паток зірне
і заўважыць: нібыта ў сне —
казкі недзе мае на дне.

І заўважыць: ля кедрача,
за казармай — шаленства травы,
ды нязменна стаіць іван-чай,
сарамлівасці вартавы.

Гэта я ў ім з табой стаяў,
вось хістаюся без цябе.
Але я — у табе, бо я
у паветры гэтым цяпер...

А шыпулькі ляцяць і нат
цені гойдаюць спакваля.
— Ці не ты гэта, мой лейтэнант?
Навічок адказвае:
— Я...

ТРЫВОЖНЫ ГАРАДОК

1

Бярэзнік расступіўся —
блішчыць спіраль бетонкі,
якую колькі часу
раскручваю да зоны,

ад КПП і далей,—
у далеч з соснаў гонкіх,
у гарадок трывожны,
дзе зорна і азонна.

Памроіш — здрыганешся
(ўсё ўбачыш ты адразу):
ангары на тэхзоне
і правадоў спляценне,

казармы на пагорку,
над прыцішэлым МАЗам
свяцільнік
на кранштэйне.

На месцы катлавана
(засыпалі сягоння)
бетон як след бярэцца:
ў палатцы — стартпляцоўка.

Пад конус калярыферы
тэмпературу гоняць,
на кола-монарэйку,
што ўлаштавана лоўка...

Абрыўкі хмар з прасвету,
калі расчыніш дзверы,

ноч над урманам скача
зорную чачотку.

Вакол палаткі гэтай
танцуюць інжынеры —
знаёма ім зямная,
да чорцікаў, работка.

Гэй, на паветра! Ў ноч!
Запахне снег язмінам,
свяцільнік пахіснецца
над заінелым МАЗам —

І я сябе убачу
(краништэйн — прычына?)
ў Мінску,
на лекцыі па супрамату...

2

Цудоўна, што магу я
сваю паслухаць памяць.
А ёсць пра што мне ўспомніць...
Тут сам гаворыць вопыт...

Па мосціку з бярвення
іду ў сваю казарму —
а на вачах цямнеюць
навокала сумёты.

Зямшар нясе натужна
і гарады, і кроны...
аж накіп з хмар злятае...
А нам няма патрэбы!

Дзяўчаты спяць самотна...
Вы не будзіце соняў,
Вы, хмары, зоры, неба...

3

Гэта зоркі пайшлі кружыцца.
Нават сосны, з шыханаў сосны,
вецем вымкнуліся ў зеніце,
ў скокі кінуліся дзівосна.

Свеце кружыцца: птушкі і кедры,
вусны і маланкаадводы,
матылёчкі і ў шахтах ракеты,
і зямля, і Паветра...

Пацалункі твае не астыгнуць,
бо кароткая чэрвеня ночка.
О высокае Працы стымул!
О юнацтва, якому не скончыцца...

БАЛАДА ПРА ПЕРШЫ З'ЕЗД РСДРП

Да Саяна здалёк
ад раўніны Валдая
праэвінеў шаргунок
і дадому спяшае.

Век стары, адыходзь!
Новы рушыць ільдзіны.
— Што наперадзе, мосць?
— Рэвалюцый часіны...

Паляцеў бы туды,
нават пеша пакрочыў,
дзе ламае ільды
Мінск вясновы, рабочы.

Звоны — ўдоўжкі і ўшыр,
за Уралам, за Камай.
З'езд вязуць у Сібір —
Маніфест і Праграму...

Ды шчыруе Вясна.
Сакавік грае Маем.
Будзіць Шушанскае
перасмешнік Валдая.

БАЛАДА ПРА ТРУБАЧА

Ігару Лучанку

Салоўкава трэль
замоўкла на дзень.
Трубач на расстрэл
пад кулі ідзе.

Запела труба —
і дзень заяснеў.
На мёртвага ўпаў
чаромхавы снег.

У Брэсце кумач
упаў на траву —
і зноўку Трубач
трымае трубу.

Паўстаў гарнізон
у дыме-агні,
ды падае зноў
на друз-камяні.

Ішоў пад агнём
з асмяглым іртом.
Ступаў у прасцяг —
І падаў рэйхстаг.

І Май палымнеў,
салютам грымеў,
калі ў самы бой
ступаў ён з трубой.

Забыўся спакой
краіне маёй,
ісці нам з трубой
і ноччу, і днём...

На трасах зямных,
касмічных — для ўсіх
мы Праўду штоміг
нясём з Трубачом.

БАЛАДА ПРА ФРУНЗЕ

Гайда-да-гайда! У бяссмерце прама —
раны рамянямі крыжуе начдыў —
скача па Уралу ценем камандарма
ленінскага гарту баявы матыў.

Гайда-да-гайда! Хто вы, пане Гайда?
Лях цябе ведае ды мусьё Калчак...
Шабля — ліхадзейка, куля — даганяйка,—
а ў стэпе уральскім зацвітае мак.

А ў позірку Фрунзе — Чырвоная плошча:
макі, макі сцягоў каля Ільіча.
Мы за вашы раны белых паласкочым,
смела паказычам з левага пляча.

Люта зацвітаюць крымскія макі
на гразі асенняй, на гнілой вадзе.
Успомняць бароны на Сіваш атакі,
як прад зоркай нашай кленчылі і дзе!

Гайда-да-гайда! Да-гайда-да-гайда!
Макі нашай Азіі шчодра ўзышлі.
Гэта з касмадрома зорнаю баладай —
з Поля Палкаводца — ўсходзяць караблі.

Шчодра ў полі макаў на Белай Русі,
кветкаю ягонай палымнее рань.
Слава аб героі легендарным Фрунзе
ходзіць звонкай песняй аж за небакрай.

Гайда-да-гайда! У бяссмерце прама —
раны рамянямі зноў перахрысціў —
скача па Уралу ценем камандарма
ленінскага гарту баявы матыў!

ЧАЛАВЕК З БУДУЧЫНІ

На каменным аркушы брусчаткі
пішуцца зямных эпох нататкі.
Будучых. Мінулых. Тут заўжды
у несмяротнасць доблесці далонь
цягнуць моўчкі Мінін і Пажарскі.
І шугае Памяці Агонь...

Чалавек у кепцы, невысокі,
па сцяне Крамлёўскай струніць крок.
Сам сабе ўсміхаецца, бо крокі
аддаюцца рэхам у паўзмрок.

Паўстае Масква, як на далоні —
першая савецкая вясна
майскім ветрам абвявае скроні,
морам сцягаў поўніцца з відна.

Голасам фантаста немач лае:
— У імгле і неба, і зямля...
Да Курыл, вашчывае, сканае —
скон давершаць куля і пятля...

Ну а ён, шчаслівы, пазірае,
як паветраны ўзлятае шар,
як аркестр курсантскі ўнізе грае
у абшар «Інтэрнацыянал»...
І шугае Памяці Агонь

для яго, вядома, для яго.
І мільёнамі палаюць сонцаў
Волхаў, Шуша, Днепр і Ангара —

і вачамі юных камсамольцаў
камунізма светліцца зара...

Нават шар паветраны
ракетай
здаўся чалавеку ў гэткі міг,—
углядаецца ў абрысы свету
новага стагоддзя прадстаўнік.

Недзе на радзіме (не ў Сімбірску.
У Калузе. Волгай — да яе...)
хтось, яму касмічнай марай блізкі,
Саўнаркому рапарт аддае...
І шугае Памяці Агонь
для яго, вядома. Для яго.

Чалавек ідзе сцяной Крамлёўскай.
Першы Рэвалюцыі салдат
на зямлю спускаецца з нябёсаў,
каб наступных дзён прымаць парад...

ЧЫРВОНАЯ ПЛОШЧА

Грукоча пад Крамлёўскаю сцяной
Чырвоная — усёй краіны — плошча.
Звіняць імёны маршалаў на ёй,
жывое сэрца Леніна грукоча.

Барацьбітоў за шчасце галасы,
і словы несмяротных касманаўтаў,
і сцяг над купалам, і бой курантаў,
і змена каравула,—
як лясы,
як вечныя лясы гучаць над плошчай.
Не заглушае гул
парадаў пошчак.

А колькі раз па гэтых камянях
я летуценнікам парыўна крочыў
к тваім
рубінавым і Вечнаму
агням,
Чырвоная — усёй краіны — плошча!

Здавалася — не галубкі
ўміг прада мною узнімаюць плёскат,—
то на франты чырвоныя палкі
каля трыбун тваіх праходзяць,
плошча!
У вечнасць і ў бяссмерце — наўпраасткі!
З трыбуны Ленін — поруч Фрунзе,—
сочаць...
Глядзяць — бо сонца грае — з-пад рукі
і на байцоў, і ў сэрца маё, плошча...

Даруй мне, плошча,
што я так з табой,
нібыта з блізкім чалавекам размаўляю,—
сваё сумленне па тваім звяраю...
Ты знай: калі спатрэбіцца, то бой,
то і сапраўдны бой,
прайду да краю...
Твае імёны пранясу з сабой!

Гручока пад Крамлёўскаю сцяной
Чырвоная — усёй краіны — плошча.
Звіняць імёны маршалаў над ёй,
жывое сэрца Леніна грукоча...

ЗМЕСТ

I. Пляцоўкі і пралескі

6 Белая Русь
8 *** Юнацтва ранак! Ты здаля...
10 Чырвоныя Казармы
12 Балада пра каваля Людоту
14 Часіна цвіцення верасу
15 Сіняе узбярэжжа
16 Здзіўленне
18 *** Прад бярозай схіляю калені...
19 Купальшчыцы ў ноч на Івана Купалу
20 Зорны вецер
21 Паланянка
22 Пі, перапёлка
23 Чырвоныя буслы
24 *** Паставога паўночная скруха...
25 Сніцца маленства
26 Гульня
28 Ах, лета, лета!
29 Вучэнні
30 На маршы
31 Бег часу
32 Калі крычалі жураўлі...
33 *** Што у памяці? Дрогкія шыбы...
34 *** Чытаць біяграфіі польскіх паэтаў...
35 *** Не! Абыякава і проста...
36 Елабуга
37 На ракетных заставах
38 Вясёлы конік
39 Позняя яблыня
40 Пад мерны марш ваеннага аркестра
41 Адбой
42 На кручах

43 *** Трымцела на пяску маранка...
44 Знак
46 Перадзім'е ў Пярмі
47 *** Пяць каласкоў маёй Радзімы...
48 Цур!
49 Стансы
50 Сенакос
51 Канцэрт
52 *** Стагоддзі будуць падаць зоркі...
53 Стартпляцоўкі
55 На пляцоўцы пражэктар гарыць
56 Пляцоўкі і пралескі
57 Вартоўня
59 Вёска
61 Вячоркі
63 Від на касцёл з гасцініцы «Мінск»
64 Груган мой, не каркай, не каркай!
65 Яхты з Таіці
67 Касманаўты
68 *** Па-над паводкаю наўсцяж...
69 Няшчасце
71 Лагі
72 Пах восені
73 Вяртанне
74 *** У сераду-сераду...
75 Змярканне
76 Бурація. Гусінаазёрск
78 Сунічная паляна
80 Белы журавель паэта
81 Запаветны рай
83 Лета
86 Паляць лісце
87 Снягі Юкона
88 Напрадвесні
89 Гены
90 *** Жудасная развязка...

91 *** Цяпер там Памяці адвечны бор шуміць...
92 *** Гараць лясы!..
93 Зямныя зоркі
94 Смерць камандзіра
95 Рабінавыя ночы
96 Верасовы свет
97 Блакада
98 Каміла Марцінкевіч едзе ў Салікамск
99 Балада пра Памяць
100 ***Гарaць кастры. Вянкі ў вадзе...
101 Таежныя анёлы
102 Развітанне з тайгой
II. Колер часу
104 Пярэдадзень
106 Колер часу
109 Ядлоўцавая Бадзь
113 Трывожны гарадок
116 Балада пра Першы з'езд РСДРП
117 Балада пра Трубача
119 Балада пра Фрунзе
121 Чалавек з Будучыні
123 Чырвоная плошча

Стрыгалёў М.

С87 Чырвоныя казармы. Лірыка. — Мн., Маст. літ., 1978.— 128 с. іл.

Міхась Стрыгалёў доўгі час працаваў ваенным інжынерам на Урале. Таму так натуральна і пераканаўча гучаць ягоныя вершы пра неспакойныя будні Савецкай Арміі.

У новым зборніку паэта радкі грамадзянскага гучання спалучаюцца з радкамі, поўнымі сыноўняга замілавання да роднай Беларусі, са шчырымі словамі інтымнай лірыкі.

С $\frac{70403-005}{М302(05)-78}$ 64—78 Бел 2

Михаил Лаврентьевич Стригалев
КРАСНЫЕ КАЗАРМЫ
Лирика
Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар Р. І. Барадулін.
Мастак М. М. Селяшчук.
Мастацкі рэдактар А. М. Малышава.
Тэхнічны рэдактар С. А. Абрамчук.
Карэктар Е. У. Дзмітрыенка.

ІБ № 81

Здадзена ў набор 29.05.78. Падп. да друку 15.12.78. АТ 09923. Фармат 70×90¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Друк высокі. Ум. друк. арк. 4,68. Ул.-выд. арк. 3,56. Тыраж 4000 экз. Зак. 763. Цана 40 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, Паркавая магістраль, 11.

Друкарня імя Францыска (Георгія) Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка» АН БССР і Дзяржкамвыда БССР. 220600, Мінск, Ленінскі праспект, 68.


40 к.